# Навігатар поспеху

**Хутка, 15 жніўня, пачнуць сваю педагагічную дзейнасць маладыя настаўнікі. Гаворачы аб працаўладкаванні маладых спецыялістаў пасля размеркавання, мы больш увагі ўдзяляем дзяржаўным сацыяльна-эканамічным гарантыям. Разам з тым нельга забываць і пра стварэнне ва ўстанове адукацыі спрыяльнай для адаптацыі пачынаючага настаўніка атмасферы.**



Менавіта камфортнае асяроддзе ў навучальнай установе з'яўляецца залогам станаўлення маладога спецыяліста ў педагогіцы і яго далейшага прафесійнага росту. А гэта складаны і працяглы працэс, дзе без дапамогі кіраўніцтва ўстановы адукацыі, педагагічнага калектыву не абысціся. Сваю падтрымку моладзі гатовы аказваць і грамадскія арганізацыі, у ліку якіх маладзёжны савет Мінскай гарадской арганізацыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

— Прафесійная адаптацыя маладых педагогаў — гэта не толькі вучэбныя праграмы, методыкі выкладання, гэта і ўваходжанне ў калектыў, наладжванне ўзаемаадносін з вучнямі, фарміраванне ўласнага стылю і падыходу да работы. Для таго каб маладое пакаленне не адчувала эмацыянальнага дыскамфорту, яму неабходна падтрымка і разуменне з боку вопытных калег. Калі атмасфера ў калектыве спрыяльная, добразычлівая, то малады педагог хутчэй прыстасуецца да новых умоў, — расказвае старшыня маладзёжнага савета Павел Кушнярэвіч.

Павел ведае, пра што гаворыць. Сам нядаўна быў маладым спецыялістам, сёння працуе ў сталічнай гімназіі № 22 настаўнікам матэматыкі і інфарматыкі, класны кіраўнік у 5 класе. Ён абсалютны пераможца конкурсу "Сталічны настаўнік — сталічнай адукацыі — 2023".

— Паспяховая адаптацыя ў многім залежыць ад знешніх фактараў. Нельга на пачатку свайго прафесійнага шляху абмяжоўвацца асяроддзем навучальнай установы. Трэба выходзіць за яго межы, імкнуцца да згуртавання з маладымі калегамі і разам шукаць новыя падыходы ў педагогіцы і назапашваць вопыт, — адзначае Павел Вячаслававіч.

Маладзёжны савет з'яўляецца крыніцай інавацый ва ўдасканаленні прафесійнага майстэрства маладых спецыялістаў. Гэта, па сутнасці, сучасны трэнд маладзёжнага руху ў педагагічнай грамадскасці, які прызваны дапамагаць маладому педагогу рэалізоўваць свой патэнцыял на педагагічнай ніве, разам з гэтым уключацца ў грамадскае жыццё і развіваць свае прафесійныя і асабістыя якасці. Маладзёжны савет створаны ў кожным раёне Мінска, супрацоўнічае з іншымі гарадамі, рэгіёнамі краіны і нават за яе межамі. Удзел моладзі ў прафесійных згуртаваннях на практыцы даказвае, як эфектыўна гэта ўплывае на прафесійную кар'еру маладых педагогаў, на іх далейшае гарманічнае развіццё, на фарміраванне індывідуальнага стылю ў працы.

Калі гаварыць пра змястоўнае напаўненне работы маладзёжнага савета, то яно вельмі разнастайнае і закранае ўсе кірункі дзейнасці маладога спецыяліста. Перш-наперш дзейсную дапамогу яму аказвае вопытны, дасведчаны педагог. З гэтай мэтай савет рэалізуе праект "Настаўніцтва: навігатар поспеху", дзе агульнай прафесійнай дзейнасцю аб'яднаны маладыя спецыялісты і вопытныя педагогі.

Павел Вячаслававіч расказвае, што новы фармат супрацоўніцтва — жывыя зносіны, якія даюць магчымасць моладзі і старэйшым калегам атрымаць пэўную асалоду ад зносін, даверліва ставіцца адно да аднаго і раскрываць сябе. Дуэт "вопытны настаўнік і малады педагог" — гэта тандэм, які вядзе да майстэрства абодвух.

Пры правядзенні майстар-класаў удзельнікі сустрэч могуць наведваць не толькі тыя, якія тычацца іх прадметаў. Прафесійную цікавасць можна задаволіць, наведваючы прэзентацыі настаўнікаў па іншых прадметах, каб паглядзець, як іншы настаўнік-прадметнік праводзіць урок, якія методыкі і прыёмы выкарыстоўвае, каб зацікавіць вучняў.

— Мае майстар-класы прысвечаны рознай тэматыцы, у тым ліку штучнаму інтэлекту і яго прымяненню на ўроку альбо ў пазакласных мерапрыемстве, — дзеліцца Павел Кушнярэвіч. — Аўдыторыя звычайна шматузроставая. Новыя тэхналогіі сёння вельмі актуальныя ў сферы адукацыі, таму і малады настаўнік, і больш вопытны імкнуцца выкарыстоўваць іх на сваіх уроках і зрабіць выніковымі і запамінальнымі.

Вельмі злабадзённай з'яўляецца тэма класнага кіраўніцтва, таму многія мерапрыемствы, якія праводзяцца маладзёжным саветам, прысвечаны менавіта ёй.

— Некаторыя маладыя педагогі, якія прыходзяць на работу, не хочуць браць класнае кіраўніцтва, — разважае старшыня маладзёжнага савета. — Ім здаецца, што не справяцца, што ім пакуль няма што даць дзецям, не ведаюць эфектыўных форм выхаваўчай работы, ды і часавыя затраты не матывуюць. Так, па вялікім рахунку настаўнік і класны кіраўнік — гэта непадзельныя паняцці, але не зусім сумяшчальныя. Гэта павінен быць своеасаблівы стыль жыцця, да фарміравання якога трэба імкнуцца кожнаму настаўніку з маладых гадоў.

Пры сённяшніх рэаліях класны кіраўнік павінен быць на многа крокаў наперадзе ад сучасных вучняў. Ён павінен быць цікавай, інтэлектуальнай асобай, валодаць разнастайнай інфармацыяй, псіхалагічнымі прыёмамі, выкарыстоўваць індывідуальны падыход, быць адукаваным і культурным чалавекам, мець непарушальны аўтарытэт у навучэнскім калектыве. Напрамкі прафесійнага развіцця класнага кіраўніка і пашырэнне яго пазнавальнай траекторыі актуалізаваны ў многіх праектах маладзёжнага савета, у тым ліку "Прафсаюз адукацыі — прафсаюз магчымасці". Удзельнікі мерапрыемства наведваюць вытворчыя прадпрыемствы і арганізацыі, каб азнаёміцца з іншымі сферамі дзейнасці, калектывамі, іх умовамі працы, з тымі прафесіямі, якія могуць быць у спісе прафесійнага выбару выпускнікоў навучальных устаноў. Гэтыя маршруты можна выкарыстоўваць для экскурсій са школьнікамі ў пазаўрочны час. Маладзёжны савет прапаноўвае шмат іншых праектаў і тым самым разнастайвае новымі арыенцірамі школьнае жыццё настаўнікаў.

Таленавітых і актыўных прадстаўнікоў адукацыйнай галіны Беларусі і Расіі аб'яднаў нядаўні міжнародны фестываль "Прафсаюз без меж", які праходзіў ужо 11-ы раз. Фестываль з'яўляецца ўнікальнай маладзёжнай пляцоўкай для абмену вопытам, умацавання прафесійных і сяброўскіх сувязей, плённага дыялогу і натхнення. Месцам яго правядзення стаў Мядзел.

— Фестываль — яскравы прыклад таго, як прафсаюзы могуць нас аб'ядноўваць незалежна ад меж і культур, — адзначае старшыня маладзёжнага савета. — Сёння прафсаюз становіцца ўсё больш мабільным і адкрытым для моладзі, і мы імкнёмся далучыць маладых людзей да цікавых спраў.

У рамках праграмы фестывалю былі арганізаваны міжнародны прафсаюзны каворкінг, мітынг памяці, серыя майстар-класаў, наведванне культурных, гістарычных аб'ектаў, Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра "Зубраня", нарачкай сярэдняй школы № 2, дзе былі праведзены мерапрыемствы, прысвечаныя 80-годдзю Вялікай Перамогі.

Нядаўна маладыя педагогі сталіцы прынялі ўдзел у рэспубліканскім конкурсе "Лепшы маладзёжны праект сярод пярвічных прафсаюзных арганізацый БПС работнікаў адукацыі і навукі". Былі вызначаны работы, якія атрымалі гранты ад прафсаюза для іх рэалізацыі. Пераможцамі конкурсу сталі гімназія № 1 імя Францыска Скарыны за дызайн-праект роставай лялькі, Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Маяк" за праект "Прафсаюз — тэрыторыя прыгажосці і магчымасцей", гімназія № 50 за праект з выкарыстаннем сучаснага абсталявання для развіцця творчых ідэй педагогаў і школьнікаў, а таксама праект сярэдняй школы № 225 "Памяць", накіраваны на захаванне гістарычнай памяці і выхаванне патрыятызму ў маладога пакалення.

# На адной хвалі

**Хрысціна Кот працуе настаўніцай англійскай мовы ў сталічнай гімназіі № 50. Яна адна з самых актыўных удзельніц маладзёжнага савета.**

— Маладзёжны савет — гэта шанс не проста гаварыць пра інавацыі, а іх рэалізоўваць. Тут ты знаходзіш сяброў, аднадумцаў, вучышся новаму і бачыш рэальны вынік. Калі ты педагог — гэта яшчэ і каштоўны вопыт, які можна прымяняць у настаўніцкай дзейнасці.

У гэтым пераканалася, калі прыйшла на першыя сустрэчы маладзёжнага савета і была ўражана той сяброўскай і адначасова дзелавой атмасферай, якая там панавала. Я ўбачыла вакол сябе шмат маладых, энергічных людзей, у кожнага з якіх была свая харызма, характар, гісторыя і мноства самых розных ідэй. Яны не баяцца спрабаваць і памыляцца. З такімі людзьмі надоўга зараджаешся энергіяй, ад іх перадаецца актыўнасць, ты разумееш: вось яно — сапраўднае кам'юніці, дзе цябе чуюць, падтрымліваюць і натхняюць. На сваіх сустрэчах мы абмяркоўваем, як зрабіць настаўніцкую працу больш эфектыўнай, якія педагагічныя тэхналогіі сёння выкарыстоўваць, як нам развівацца ў далейшым.



І гэта не проста размовы. Мы рэальна ўвасабляем праекты: арганізуем форумы, квесты, адукацыйныя праграмы. Акрамя выкладання англійскай мовы, я вяду класнае кіраўніцтва, і ўсё, што даведваюся на сустрэчах з калегамі ў маладзёжным савеце, мне хочацца ўкараніць у зносінах з вучнямі. Напрыклад, мы з дзецьмі правялі ў гімназіі квест, які прысвяцілі прафарыентацыі. Ідэю такога мерапрыемства я ўзяла з праектаў маладзёжнага савета. На сустрэчах у савеце мы дзелімся сваімі напрацоўкамі, многія з якіх я бяру на ўзбраенне. Прыкметна актывізаваліся і мае вучні. Яны прапануюць свае ініцыятывы, дапамагаюць арганізоўваць мерапрыемствы. Атрымліваецца такі кругаварот энергіі і ідэй!

Асабліва натхняюць міжнародныя праекты, у якіх прадстаўляеш сваю краіну. Гэта гордасць і новая крыніца ведаў. Успамінаецца міжнародны фестываль у Мядзеле. Невялікі ўтульны горад, дзясяткі каманд з Беларусі і Расіі і мора энергіі. У выніку мы набылі вопыт, якога не знойдзіш ў інтэрнэце: рэальныя кейсы, працоўныя схемы, разнастайныя прыклады. Мы прадстаўляем розныя гарады, рэгіёны, краіны, але маем агульныя каштоўнасці і жаданне мяняць свет да лепшага.

> *"Маладзёжны савет — гэта шанс не проста гаварыць пра інавацыі, а іх рэалізоўваць. Тут ты знаходзіш сяброў, аднадумцаў, вучышся новаму і бачыш рэальны вынік.*

А прафсаюз — гэта рэальны трамплін для моладзі. У нашай гімназіі мы падалі заяўку на рэалізацыю маладзёжнага праекта — набыццё гуказапісвальнай студыі. Распрацавалі яе абгрунтаванне ў выхаваўчай рабоце з навучэнцамі. І наш праект увайшоў у лік пераможцаў. Хутка ў гімназіі з'явіцца свая гуказапісвальная студыя. Мы зможам запісваць падкасты, музыку, аўдыяпраекты — усё, на што хопіць фантазіі. Прафсаюз нас аб'ядноўвае, дае рэсурсы, падтрымку і веру ў сябе.

**Матэрыялы Алы КЛЮЙКО.**